Плюралізм Стар. 3

Рэгіёны Стар. 4-5

Беларусь Стар. 7-8



№46

ЛЮТЫ 2009

# Выбар

Газэта Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў


# На магілёўскія будынкі не знайсьці гаспадара

У МАГІЛЁВЕ Ў КРЫЗІСЕ АПЫНУЛАСЯ ГАРАДЗКАЯ НЕРУХОМАСЬЦЬ. НА ЎТРЫМАНЬНЕ БЕЗГАСПАДАРНЫХ БУДЫНКАЎ ТРАЦІЦЦА БОЛЬШ ЗА МІЛЬЯРД РУБЛЁЎ.

Памяшканьні, якія ня маюць гаспадара — гэта падвалы, будынкі на гарадзкой пэрыфэрыі, а таксама будынкі ў аварыйным стане. Каб іх прадаць альбо здаць у арэнду, летась меркавалася арганізаваць 31 аўкцыён, адбылося ж толькі два. З трыццаці аб'ектаў прадалі ўсяго чатыры.

“У нас не выкарыстоўваецца 36.900 квадратных мэтраў плошчаў. Асноўная іх праблема — гэта тэхнічны стан”, — прызнае супрацоўніца магілёўскага гарвыканкаму.

Улада імкнецца прадаць занядбаную маёмасьць.



ГЭТЫ ДОМ ПА ВІЛЕНСКАЙ ВУЛІЦЫ Ў ЦЭНТРЫ МАГІЛЁВА СТАІЦЬ БЕЗ ГАСПАДАРА ДВА ДЗЯСЯТКІ ГАДОЎ

Ня хочуць бізнэсоўцы набываць занядбаныя памяшканьні нават і па заніжаным кошце. А тым часам гарадзкія ўлады патрацілі летась на іх утрыманьне больш як адзін мільярд рублёў.

Гарвыканкам абавязаў камунальныя службы да першага сакавіка адрамантаваць занядбаную маёмасьць. Чыноўнікі разьлічваюць, што там могуць знайсьці сабе працу звольненыя з прадпрыемстваў работнікі:

“Будуць створаныя новыя працоўныя месцы. Людзі будуць занятыя. Як бы там ні было, на прамысловых прадпрыемствах праводзіцца аптымізацыя колькасьці. І, безумоўна, народ пераходзіць з гэтага сэгмэнту ў сфэру паслугаў”, — цьвердзіць намесьнік старшыні гарвыканкаму.

Без гаспадароў гібеюць і помнікі архітэктуры.

Ці апраўданыя спадзяваньні чыноўнікаў? Магілёўскі каардынатар грамадзкага аб'яднаньня “Рух “За свабоду” Віталь Васількоў зазначае, што мала прапанаваць бізнэсоўцам памяшканьні, нават і па заніжаным кошце:

“Гэтыя памяшканьні сумнеўныя. Сумнеўныя ў тым, што патрабуюць вялікіх укладаньняў капітальных. Новыя ўласьнікі павінны мець гарантыі, што укладзеныя сродкі ня будуць потым гэтаксама лёгка, як ім перадалі гэтыя аб'екты, адабраныя зноў дзяржавай”.

Сярод занядбаных будынкаў, якія застаюцца без гаспадароў, ёсьць і помнікі архітэктуры. Два зь іх стаяць у цэнтры гораду на вуліцы Віленскай. Іх узьвялі ў 1909 годзе. Як удалося высьветліць, іх зьбіраюцца рэканструяваць, аднак калі — невядома.

*Андрэй Белагубаў*

№46 ЛЮТЫ 2009 Выбар

# «Ленінскаму клічу” пагразілі пальцам

Чавускі раённы суд не задаволіў пазоў рэдактара газэты "Вольны горад" Сяргея Няроўнага й заснавальніка выданьня Ўладзімера Кудраўцава супраць рэдакцыі газэты крычаўскага райвыканкаму "Ленінскі кліч".

Праз суд журналісты недзяржаўнага выданьня намагаліся абараніць свае гонар, годнасьць і дзелавую рэпутацыю, а таксама спагнаць кампэнсацыю маральнай шкоды ў памеры 10 мільёнаў рублёў.

Судовы працэс пачаўся яшчэ 28 сьнежня 2007 году. Нагодай для яго сталіся гумарэскі, якія публікавала крычаўская раёнка кожную суботу з 2005 да 2007 году. Іх, як высьветліў суд, пісалі рэдактарка "Ленінскага клічу" Тацяна Іўкіна, яе намесьнік Уладзімер Далецкі, а таксама карэспандэнты выданьня Аляксандар Гаўрыленка ды Анатоль Іваноў.

У гумарэсках апісвалася дзейнасьць крычаўскіх апазыцыйных палітыкаў, грамадзкіх актывістаў ды журналістаў недзяржаўных выданьняў. Паводле лінгвістычнай экспэртызы, у пэрсанажах гумарэсак празь віды дзейнасьці, характарыстыкі, палітычныя прыхільнасьці пазнаюцца канкрэтныя асобы, хоць іх прозьвішчы й скажоныя да зьневажальных мянушак.

Сяргей Няроўны адразу ж пасьля судовага паседжаньня паведаміў, што судзьдзя Алена Каралько праігнаравала вынікі экспэртызы:

"Яна нічога пра экспэртызу не сказала. Суд не пазнаў у «Крывым» Няроўнага, а ў «Кучаравым» — Кудраўцава. Калі ведаць сытуацыю зь беларускімі судамі й з пракуратурай, вырак у прынцыпе заканамерны. Цяпер галоўнае, што мы павінны зрабіць у нашай газэце, дык напісаць пра гэты працэс. Для нас важна, што думаюць наконт гэтага крычаўскія чытачы, а ня чавускі суд".

Паводле Сяргея Няроўнага, судзьдзя папярэдзіла выдаўцоў "Ленінскага клічу" пра недапушчальнасьць падобных публікацыяў у будучыні. Што да выраку, то спадар Няроўны кажа, што будзе яго абскарджваць у Магілёўскім абласным судзе.

*Паводле Радыё Свабода (Магілёў)*

## КАМЭНТАР РАДАКТАРА

Больш за ўсё мяне тут уразіла фраза пра "недапушчальнасьць у будучыні". Ня надта моцны ў юрыспудэнцыі, але мяркую, што гэтым самым Высокі суд дэ-факта прызнаў-такі віну журналістаў "Клічу", перакрэсьліўшы ўласнае дэ-юрэ рашэньне.

Добра ведаючы Сяргея Няроўнага ды ягоную журналісцкую каманду, не сумляваюся, што адэкватна адказаць (ледзь не напісаў – "калегам", ды не – якія ж там журналісты!) супрацоўнікам з "ЛК" яны здолеюць нават у цяперашніх умовах. Гаворка тут аб іньшым. Маючы дастатковы досьвед чытаньня савецкіх газэт, міжволі навучыўся чытаць "паміж радкоў". Але на мой погляд, настае на Беларусі час, калі тым жа чынам трэба вучыцца чытаць амаль што любы афіцыез: рашэньні судоў, дакумэнты ўраду, падручнікі гісторыі…

Ну, ды не прывыкаць. Вось толькі крыху шкада (а крыху дык зь іх і сьмешна) бывае чыноўнікаў, якіх вышэйшая улада зрабіла крайнімі ў гэтых гульнях. Маўляў, вось вам умовы, і хоць яны ня надта адпавядаюць закону, але мы нічога ня ведаем – круціцеся, як хочаце.

Вось і ствараюцца у канторах шматлікія адпіскі, поўныя недагаворак ды абцякаемых фразаў, а іх аўтары, ня маюць сьмеласьці адарваць вочы ад стала і паглядзець у твар тым, хто да іх зьвяртаецца. Цяжкавата ім, небаракам, так сядзець увесь дзень, апусьціўшы вочы. Пры гэтым, практыка паказвае, што атрымаўшыся паміж двух полымяў (Законам і Начальнікам) непакояцца гэтыя сталаначальнікі толькі пра адно – абы пранясло, абы не стаць крайнім. Бо калі што, калі прыпячэ – "здадуць" уласныя "босы", нібы шклатару, як здалі нядаўна вядомых "абаронцаў Закону" у Менскай вобласьці.

Крычаўскім жа калегам я шчыра зычу посьпехаў ў іх працы і пермогі Закона над чыноўнічымі "паняцьцямі".

*Эдуард БРОКАРАЎ*



АНДРЭЙ ЮРКОЎ НІКОЛІ НЕ БАЯЎСЯ ДЫСКУСЫЯЎ

АЛЕ

# Читатели «Ленинского шляха» ответили Андрею Юркову

Горецкая районная газета «Ленинский шлях» разместила два письма от местных граждан, написанных ими в качестве отзыва на опубликованную там ранее статью лидера местной региональной коалиции демократических сил Андрея Юркова «Тут і цяпер». Кроме горецкой районки статья была прдложена официальным изданиям Мстиславского и Дрибинского районов, однако там ее проигнорировали. Наши читатели могли ознакомиться с ней на страницах “Выбора” №1 за текущий год.

Автор первого из откликов осуждает план Андрея Юркова по сотрудничеству с местными властями и предотвращению кризиса, а второй его поддерживает. Причем оба отозвавшихся на публикацию читателя живут в д.Горы и являются пенсионерами.

Ознакомиться с содержанием развернувшейся в районной газете полемики можно в номере «Ленінскага шляха” за 14 февраля, а также на сайте Horki.info.

*Иван Морозов*

А ТЫМ ЧАСАМ...

## На бабруйскую раёнку просяць завесьці справу

Актывіст Свабоднага прафсаюзу Беларускага Міхаіл Кавалькоў патрабуе ад генэральнай пракуратуры завесьці крымінальную справу супраць рэдакцыі афіцыйнай газэты "Бабруйскае жыцьцё".

Нагодай для скаргі стаўся артыкул, які, паводле Міхаіла Кавалькова, зьневажае ягоныя гонар, годнасьць і дзелавую рэпутацыю.

Тэкст быў апублікаваны ў "Бабруйскім жыцьці" 24 верасьня 2009 году падчас выбарчай кампаніі ў Палату прадстаўнікоў, куды балятаваўся Міхаіл Кавалькоў.

"Я быў кандыдатам у дэпутаты і перакананы, што артыкул пад назвай "Кузнец своего "величия", или Полигамный враль-ман" аўтара Ал.Паліндрона паўплываў на пазыцыю выбарцаў, якія зьбіраліся галасаваць за мяне. У ім у зьняважлівай форме апісваецца мае прыватнае жыцьцё, падаецца несапраўдная інфармацыя пра суполку Свабоднага прафсаюзу Беларускага на заводзе трактарных дэталяў і агрэгатаў, якой я кірую. Пакуль усе мае спробы дамагчыся ад праваахоўных органаў пачатку крымінальнай справы супраць аўтара артыкулу і рэдакцыі "Бабруйскага жыцьця" застаюцца безвыніковымі. Але я буду дамагацца свайго, нават калі мне давядзецца зьвяртацца ў міжнародныя судовыя інстанцыі", - зазначае Міхаіл Кавалькоў.

Перш чым паскардзіцца ў генэральную пракуратуру, Міхаіл Кавалькоў пісаў у пракуратуру Маскоўскага раёну Бабруйска і ў абласную пракуратуру. Паўсюль адказ адзін: "у задавальненьні скаргі адмовіць праз адсутнасьць складу злачынства".

Міхаіл Кавалькоў - старшыня завадзкой прафсаюзнай суполкі ад 1998 году. Суполка налічвае каля 350 чалавек. Ад 2006 году Кавалькоў абраны кіраўніком рэспубліканскай арганізацыі Свабоднага прафсаюзу Беларускага.

*Радыё Свабода*

САМІ З ВУСАМІ

## КІРАЎНІКУ МАСТОЎШЧЫНЫ НЕ ПАТРЭБНЫ ПАРАДЫ АД АПАЗІЦЫІ

Каардынатар Руху "За Свабоду" па Гарадзеншчыне Алесь Зарэмбюк атрымаў адказ на сваю прапанову стварыць пры райвыканкаме грамадзка-кансультатыўную Раду.

Старшыня Мастоўскага райвыканкама Аляксей Шафарэвіч ў сваім лісце да актывіста паведаміў, што стварэнне грамадзка-кансультатыўнай Рады не плануецца.

Нагадаем, 29 студзеня сябра Рады ПАГА Рух “За Свабоду” Алесь Зарэмбюк накіраваў у Мастоўскі райвыканкам зварот з прапановай стварыць пры Мастоўскім райвыканкаме грамадзка-кансультатыўную Раду з удзелам прадстаўнікоў мясцовай улады, палітычных партый, грамадзкіх арганізацый, прафсаюзаў.

Выбар №46 Люты 2009

## НЯМА ЧЫМ ХВАЛІЦЦА

Як паведаміў аддзел статыстыкі Бялыніцкага раёна, намінальная налічаная сярэднемесячная зарплата работнікаў галін эканомікі раёна ў 2008 годзе склала 687,1 тысячы рублёў і павялічылася ў параўнанні з папярэднім годам на 23,6 працэнта.

Здаецца, што можна толькі парадавацца росту дабрабыта бялынічан. Але, як кажа народная мудрасць, усё пазнаецца ў параўнанні з іншым. Таму давайце параўнаем заробак бялынічан з сярэднім заробкам па нашай Магілёўскай вобласці і па краіне ў цэлым. Сярэдні памер налічанага намінальнага заробку ў Беларусі ў 2008 годзе складаў больш за 885 тысяч рублёў за месяц.

У Магілёўскай вобласці намінальны налічаны заробак заробак быў амаль на 100 тысяч меншы, чым у сярэднім па краіне – 795 тысяч рублёў. Дарэчы, старшыня камітэту па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага аблвыканкаму Ганна Апет прызнала: "У 2008 годзе тэмп росту заробкаў склаў толькі 123 працэнты й быў самы нізкі сярод усіх абласцей Беларусі".

Як звычайна, менш за ўсіх у мінулым годзе у нашай вобласці атрымлівалі тыя, хто корміць – працаўнікі сельскай гаспадаркі, а таксама работнікі сацыяльнага забеспячэння. Іх сярэдні заробак у мінулым годзе склаў 518.1 тыс. рублёў і 510,1 тыс. руб. суадносна.

Так што, паважаныя чытачы, вы самі бачыце, што бялынічане у мінулым 2008 годзе зарабілі значна менш, чым у сярэднім па краіне і нават па Магілёўскай вобласці – на 198 і 108 тысяч рублёў.

Калі ж яшчэ ўспомніць, што інфляцыя ў мінулым годзе ў нашай краіне па афіцыйных звестках склала 13.3 % (у тым ліку на прадукты харчавання 15,9 %), а ў студзені 2009 г. беларускі рубель абясцэніўся яшчэ на 4,1 %, дык рост заробкаў працаўнікоў раёна нагогул здаецца нязначным. Але ў гэтым годзе і такога росту, хутчэй за ўсё, нябудзе…

*Іван Барысаў*

## У Бялынічах створана суполка прафсаюза РЭП

У мінулую суботу ў Бялынічах адбыўся ўстаноўчы сход і была створана раённая суполка Беларускага прафсаюза работнікаў радыёэлектроннай прамысловасці і другіх галін народнай гаспадаркі (РЭП).

Перад прысутнымі выступіў прадстаўнік абласной арганізацыі прафсаюза РЭП Юрый Дарашэнка. Ён распавёў аб накірунках дзейнасці прафсаюза па абароне правоў працоўных у іх адносінах з наймальнікамі. Таксама было адзначана, што незалежны прафсаюз РЭП – гэта арганізацыя, якая сапраўды адстойвае інтарэсы сваіх чальцоў. Прафсаюз РЭП заўсёды дапаможа вырашыць праблемы з наймальнікам, у вобласці аховы працы, іншыя праблемы альбо акажа кваліфікаваную кансультацыю бясплатна.

Прыватны прадпрымальнік Алег Мяцеліца выказаў меркаванне, што стварэнне Бялыніцкай суполкі прафсаюза РЭП дапаможа шмат каму з бялынічан у гэты нялёгкі час, калі ідзе памяншэнне рэальных заробкаў працоўных і мноства людзей пазбаўляецца працы.

*Барыс Вырвіч*

## У Бабруйскім СІЗА новы палітвязень

Кіраўнік Асіповіцкай філіі незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт" Арцём Дубскі знаходзіцца ў бабруйскім сьледчым ізалятары.

Паводле трэцяй па ліку крымінальнай справе, яго вінавацяць у парушэньні ўмоваў адбыцьця пакараньня, у тым, што ён зьехаў з Асіповічаў. Паводле закону, яго могуць перавесьці адбываць пакараньне ў больш жорсткія ўмовы – у папраўчую калёнію.

13 лютага хлопца зьнялі зь цягніка на беларуска-ўкраінскай мяжы, калі ён накіроўваўся ў Менску на адзначэньне Дня Сьвятога Валянціна.

Арцём Дубскі – фігурант "справы 14-ці". У 2008 годзе яго пакаралі двума гадамі абмежаваньня волі за ўдзел у акцыях пратэсту прадпрымальнікаў.

Асіповіцкая міліцыя распачала супраць Арцёму яшчэ адну крымінальную справу. Хлопца зьвінавацілі ў тым, што з чужой сім-карткі ён выйшаў у інтэрнэт і нанёс страту кампаніі "Вэлкам".

Арцём зьехаў ва Ўкраіну і яго судзілі завочна. Ён мусіць выплаціць 3,5 мільёны рублёў кампэнсацыі.

*Радыё Свабода*

## "Долг платежом красен..."

На 18-гадовага бабруйчаніна і яго падзельніка 31-гадовага мінчука заведзена крымінальная справа па артыкулу 233 ч.2 (супрацьзаконная прадпрымальніцкая дзейнасць).

З снежня 2007 па верасень 2008 года, як паведамляе БелаПАН, яны ажыцяўлялі супрацьзаконную прадпрымальніцкую дзейнасць па продажы аўтамабіляў. За гэты перыяд сябры атрымалі даход у памеры 150млн.рублёў.

*Бабруйск: рэгіянальны партал*

# Каму патрэбна гэта хлусня?

Ужо неаднаразова даводзілася пісаць пра праблему беспрацоўя ў нашым Бялыніцкім раёне, але вырашыў зноў вярнуцца да гэтай тэмы. У першую чаргу таму, што яна працягвае хваляваць нашых чытачоў і пры сустрэчах многія з іх шмат цікавага распавядаюць пра тое, колькі давялось пахадзіць, каб знайсці якую-небудзь больш-менш прыстойную працу, альбо пра тое, што даводзіцца выносіць, каб яе не страціць. Прычым расказваюць на ўмовах ананімнасці, бо за гады кіравання "усенароднаабранага" людзей запужалі так, што яны баяцца галосна выказацца нават наконт уласных непрыемнасцей. Асабліва гэта датычыцца так званых "бюджэтнікаў", якія, дзякуючы пераводу на кантрактную сістэму, здаецца, наогул развучыліся абараняць свае правы і вымушаны выконваць любыя, нават самыя бязглуздыя, загады кіраўнікоў. Другой прычынай стала чарговая прасягнутая аптымізмам нататка ў № 9 раённай газеты "Зара над Друццю" ад 4 лютага аб тым, што па стану на 1 студзеня гэтага года ўзровень рэгістрыруемага беспрацоўя ў нас у раёне склаў 1,1 працэнта ад агульнай колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва пры заданні на год 1,4 %. Дарэчы, колькі ж канкрэтна чалавек з'яўляюцца беспрацоўнымі на думку нашага мудрага кіраўніцтва, не сказана ні ў гэтай нататцы, ні ў разгорнутым матэрыяле "Наш раён у 2008 годзе" нашых доблесных статыстыкаў, змешчаным у № 12 "Зары над Друццю" ад 14 лютага. Паведамляецца толькі, што спісачная колькасць работнікаў склала летась 7453 чалавекі і на ўмовах сумяшчальніцтва і па грамадзянска-прававых дагаворах на работу прыцягваліся яшчэ 289 чалавек. Па дадзеных газеты "Паходня", на пачатак 2008 года на ўліку ў раённым цэнтры занятасці насельніцтва знаходзілася 134 беспрацоўных, з якіх атрымлівалі дапамогу па беспрацоўі толькі 42 чалавекі. Пра памер гэтай дапамогі наогул казаць смешна, згодна афіцыйнай статыстыкі яна не перавышае 50 тысяч рублёў, гэтых грошай якраз хопіць адзін раз схадзіць у магазін за прадуктамі. У сельскай мясцовасці на пачатак мінулага года, па афіцыйных дадзеных, было 48 беспрацоўных (36 %). Трэба толькі радавацца і скакаць ад шчасця, беспрацоўе за 2008 год яшчэ больш значна скарацілась і хутка наблізіцца да нуля…

Ніяк не магу зразумець, чаму ўлада лічыць свой народ за дурняў і з такім цынізмам вешае нам на вушы локшыну (лапшу). Ні для каго не сакрэт, колькі намаганняў патрэбна прыкласці, каб знайсці хоць якую небудзь прыстойную работу ў нас у Бялыніцкім раёне. А стаць на ўлік у раённым цэнтры занятасці для чалавека, які шукае работу, ператварылася ў вялізную праблему. Калі вы пражываеце ў сельскай мясцовасці і маеце крошку зямлі і падсобную гаспадарку, то ні ў якім выпадку ў якасці беспрацоўнага зарэгістраваны не будзеце, аб гэтым ужо даўно існуе негалоснае ўказанне. Тое самае будзе, калі вы звольніліся з папярэдняга месца працы па ўласнаму жаданню альбо па дамове бакоў (соглашению сторон). За мінулы тыдзень нам у рэдакцыю патэлефанавала ўжо некалькі чалавек, якіх адмовілiсь паставіць на ўлік у якасці беспрацоўных па гэтаму чынніку. Найбольш яскравы прыклад з былой супрацоўніцай упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкама Г., якую, пасля таго як яе настойліва "папрасілі" звольніцца, не ставілі на ўлік у службе занятасці, , куды яна не аднойчы звярталася, амаль год. А колькі маладых людзей, маючы вышэйшую адукацыю (а нярэдка і дзве), не могуць знайсці работу ў Бялынічах і на ўлік у якасці беспрацоўных іх таксама не ставяць… Пры ўсім гэтым у райвыканкаме і іншых "хлебных" месцах нашага раёна працуе процьма пенсіянераў і блізкіх сваякоў. У сельскую гаспадарку работаць іх не цягне… Але гэта тэма ўжо іншага артыкула, "Паходня" абавязкова надрукуе яго ў бліжэйшы час.

Ну а тое, што ўлада лічыць нас не вельмі разумнымі людзьмі і даказваць не трэба. Інакш не быў бы змешчаны на 6 старонцы таго ж № 9 газеты "Зара над Друццю", у якім паведамлялась на першай старонцы аб амаль поўнай перамозе над беспрацоўем у асобна ўзятым Бялыніцкім раёне, матэрыял пракурора раёна Міхаіла Андросенкі "Злачынствы і пакаранні". У гэтым артыкуле паважаны пракурор раёна піша: "У сельскай мясцовасці значна павялічылася колькасць непрацуючых грамадзян у працаздольным узросце. Па апошніх дадзеных, на вёсцы не заняты працай больш за 500 чалавек ва ўзросце ад 18 да 60 гадоў".

Мне можна было б нічога не дабаўляць да слоў шаноўнага Міхаіла Андросенкі, але я ўсё ж адзначу, што па маіх падліках, якія рабіліся некалькі гадоў таму і якія пацвердзіў тагачасны кіраўнік цэнтра занятасці ў прыватнай гутарцы, у Бялыніцкім раёне на той час налічвалася каля двух тысяч чалавек працаздольнага ўзросту, якія нідзе не працавалі на сталай аснове альбо выязжалі на працу ў Расію ці былі заняты ў "ценявым" сектары эканомікі. Думаю, сітуацыя за гэты час калі і змянілася, дык у горшы бок. Лічба гэта вызначаецца вельмі проста: ад агульнай колькасці насельніцтва раёна адымаецца колькасць дзяцей да 18-гадовага узросту, людзей, якія атрымліваюць сацыяльную пенсію альбо пенсію па ўзросту, навучэнцаў ліцэя старэй за 18 гадоў і агульную колькасць афіцыйна працуючых. Дарэчы, шмат хто з працуючых заняты на ўмовах няпоўнага рабочагу часу, атрымліваючы за гэта суадносны заробак. І колькі ўлада не будзе вешаць нам локшыну на вушы і рапартаваць аб чарговых перамогах над беспрацоўем, праблема будзе толькі паглыбляцца. Ужо зараз у раён вярнулася шмат людзей, якія пастаянна працавалі ў Расіі і гэту працу згубілі, прычым многія з іх нават не атрымалі зароблены грошы. Амаль усе прадпрыемствы паменшылі выплату рэальнай зарплаты працоўным, шмат у якіх арганізацыях людзей адпраўляюць у адпачынак за свой кошт (аўтабаза № 7, райаграпрамтэхзабеспячэнне, крухмальны завод і г. д.), заробак у сельскагаспадарчых прадпрыемствах застаецца на вельмі нізкім узроўні, таму ўладкавацца туды на работу амаль задарма людзі не надта жадаюць.

Не жадаюць улады паказваць рэальнае беспрацоўе і ў маштабах усёй краіны. Для прыкладу, на пачатак 2008 года у краіне афіцыйна налічвалася каля 44 тысяч беспрацоўных, а згодна афіцыйнай статыстыкі МУС, з амаль 78 тысяч выяўленых у 2007 годзе асоб, здзейсніўшых злачынствы, 14 тысяч аказаліся рабочымі, 1,8 тысячы – служачымі, 4,8 тысячы – навучэнцамі, і 53 (!) тысячы – асобамі, нідзе не працуючымі і якія нідзе не вучыліся. Па-мойму, больш ніякіх каментароў даваць непатрэбна…

***Барыс Вырвіч***

№46 Люты 2009 Выбар



# Мілінкевіч: Сапраўдны дыялог пачынаецца з нулявога варыянта

У МІНСКУ АДБЫЛАСЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ РУХУ ЗА СВАБОДУ", НА ЯКОЙ БЫЛІ ПРЫНЯТЫЯ ЗМЕНЫ Ў СТАТУТ І АБМЕРКАВАНА СТРАТЭГІЯ АРГАНІЗАЦЫІ НА БЛІЖЭЙШЫ ПЕРЫЯД.

У статут уносяцца змены, якія рэгламентуюць стварэнне і дзейнасць рэгіянальных структураў Руху "За Свабоду". Прапануюцца таксама змены, якія рэгламентуюць правядзенне канферэнцыі грамадскай арганізацыі і зробяць больш дасканалай працу аб'яднання. Уводзіцца магчымасць дэлегавання на канферэнцыю сябраў Руху ад тэрыторыі, дзе няма мясцовых структураў арганізацыі. Тэрытарыяльныя структуры будуць 2-х узроўневыя: абласныя і ўласна тэрытарыяльныя. Абласная структура будзе мець мясцовую Раду.

Прадугледжана магчымасць стварэння выканаўчага органа, які будзе адказваць за рэалізацыю рашэнняў, прынятых кіруючым органам.

На канферэнцыі абмяркоўваліся пытанні ўнутранай і знешняй палітыкі Беларусі. Дэлегаты выказаліся за дыялог паміж аб'яднанай Еўропай і нашай краінай, падкрэслівалі, што Рух "За Свабоду" павінен заняць у ім сваё месца і мець актыўную пазіцыю ў яго рэалізацыі.

У сваім выступе лідэр Руху заявіў:

Мы разглядаем новыя крокі ў знешняй палітыцы не як дыялог асобаў, а як дыялог Еўразвяза і Беларусі. Трэба глядзець, што выгадна нашай краіне, яе народу, што спрыяе дабрабыту людзей, умацоўвае незалежнасць. Калі мы любім сваю Бацькаўшчыну, мы абавязаныя думаць пра будучыню нашых дзяцей сёння, нават ва ўмовах аўтарытарнага рэжыму. Эгаістычна разглядаць тое, што адбываецца зараз у Беларусі толькі з пункту гледжання барацьбы апазіцыі з Лукашэнкам.

Бесперспектыўна для нас заняць пазіцыю выключна староннiх ацэншчыкаў працэсу дыялогу. Наша асноўная задача – ісці да людзей, тлумачыць ім выгады і перспектывы еўрапейскай будучыні Беларусі. Трэба з дапамогай праеўрапейскай інфармацыі, асветы, адукацыі змяняць іх менталітэт, свядомасць, светапогляд на карысць устойлівага еўрапейскага выбару. Упершыню за апошнія дзесяць гадоў мы можам рабіць і тое, чаго не адмаўляе ўлада.

Сённяшняя ўнутраная палітыка гэта не толькі бокс, а ўсё больш - шахматы. Гуляць трэба не эмоцыямі, а розумам. Лічу, што было б непрабачальнай памылкай страціць гістарычную магчымасць удзелу ў Праграме Усходняга партнёрства. Што тычыцца нашых першасных патрабаванняў, то яны простыя: улада мусіць спыніць палітычна матываваныя пераследы. Трэба рэалізаваць "нулявы варыянт": рэальная дэмакратызацыя пачынаецца з поўнай адсутнасці рэпрэсіяў і ўціску супраць іншадумцаў. Упэўнены, што Еўразвяз падзяляе такую пазіцыю.

На думку лідэра Руху "За Свабоду", ЕЗ безумоўна зацікаўлены ва ўстойлівым развіцці Беларусі, у прасоўванні дэмакратыі і захаванні суверэнітэту. "Многія ў Еўропе паверылі ў магчымасць вяртання Беларусі ў еўрапейскую цывілізацыю, і мы не маем права згубіць такі шанец, ні апазіцыя, ні ўлада".

На паседжанні таксама выступілі Віктар Карнеенка, Аляксей Кавалец, Віталь Васількоў, Леанід Гаравы, Рыгор Кастусёў, Уладзімір Кацора, Хрыстафор Жэляпаў ды іншыя сябры Руху "За Свабоду".

## МІЛІНКЕВІЧ НЕ ВЫКЛЮЧАЕ ДАТЭРМІНОВЫЯ ВЫБАРЫ Ў ПАРЛАМЕНТ

Лідэр Руху "За Свабоду" Аляксандр Мілінкевіч падрыхтаваў для прадстаўнікоў ПАРЭ шэраг прапаноў.

Аляксандр Мілінкевіч плануе агучыць свае прапановы на сустрэчы з дэлегацыяй Парламенцкай асамблеі Рады Еўропы, якая адбудзецца сёння ў Мінску.

На думку Аляксандра Мілінкевіча, без сяброўства Беларусі ў Радзе Еўропы у нас не будзе паўнавартаснага супрацоўніцтва. "Нам вельмі важна быць у складзе гэтай міжнароднай арганізацыі. Беларусь адзіная еўрапейская краіна, якая не з'яўляецца сябрам Рады Еўропы".

Галоўнай перашкодай на шляху далучэння Беларусі да Рады Еўропы з'яўляецца нелегітымнасць беларускага парламента. На думку Аляксандра Мілінкевіча, натуральным выйсцем з гэтага становішча былі б датэрміновыя выбары заканадаўчага органа:

На жаль, выбары восенню мінулага года прайшлі недэмакратычна, Еўропа Палату прадстаўнікоў не прызнала і дзверы Рады Еўропы перад намі закрыліся. Найлепшым выйсцем з гэтай сітуацыі будзе правядзенне датэрміновых выбараў у парламент.

На дадзеным этапе супрацоўніцтва з Радай Еўропы лідэр Руху "За Свабоду" лічыць магчымым стварэнне ў гэтай арганізацыі сумеснай дэлегацыі ад Беларусі, складзенай на парытэтных пачатках з прадстаўнікоў Палаты прадстаўнікоў і дэмакратычнай супольнасці.

# Рабочие МАЗа готовы выйти на площадь

Ситуация на Минском автозаводе близка к критической. Рабочие заявляют, что готовы отстаивать свои права на улице.

Сегодня на площадках автозавода стоят сейчас более восьми тысяч автомобилей. Не от сытой жизни людей заставляют уходить в «отпуска» за свой счет.

«Мы начали сыпаться с конца прошлого года, -- рассказывает сайту Regionby.org рабочий МАЗа Владимир Волков с 29-летним стажем работы на предприятии. -- Тогда была фактически скрытая безработица. Людей просили писать заявления на третью смену, на пятницы за свой счет, и каждый из работников, таким образом, потерял более 200-300 тысяч рублей».

По словам Волкова кризис на МАЗе коснулся всех.

«В частности, такое было в стальельцехах №1, 2, ЛКЧ - литейке ковкого и серого чугуна, механосборочном производстве - а это главный конвейер. Коснулось это так же прессо-кузовного производства, где люди писали заявления за свой счет», -- говорит он.

Рабочий Минского автозавода рассказывает, что со стороны руководства официального руководства местным работникам не оказывается никакой помощи.

«Насколько мне известно, -- говорит Волков, -- была лишь одна попытка вмешательства в происходящее: когда речь зашла о невыплате материальной помощи к отпускам. Но они защищали не столько рабочих и ИТР, сколько себя. К примеру, сравним зарплату. Есть у нас председатель профкома завода. Был когда-то хорошим лидером, прекрасным парнем - Михаил Будай. Его официальная зарплата - 2 500 000 рублей. И вот посмотрите: если этот человек не получит 80 процентов помощи - потеряет практически два миллиона! Вдвое больше рабочего!»

Как заявляет Владимир Волков, сегодня МАЗ фактически не работает.

«Минский автозавод 6 и 9 февраля не работал, -- рассказывает он. -- Был объявлен целосменный простой. В некоторых подразделениях писали заявления за свой счет. К ним подходили мастера и как бы намекали или даже требовали написать это добровольно. Хочу привести два примера. Двое моих товарищей, единомышленников, приняли разное решение. Один из них подписал заявление на три дня за свой счет после напоминания о контракте. А вот друг из механосборочного цеха категорически отказался. В результате ему оформили простой по вине руководства с оплатой двух/третей тарифной ставки. Это пример, достойный подражания. Каждый человек должен знать свои права и уметь добиться их реализации».

По словам Волкова, у работников МАЗа уже нет прежнего доверия к предприятию.

«У людей начинается просыпаться чувство самосознания, -- говорит рабочий. -- Это можно заметить на некоторых производственных участках, но особенно в курилках, где практически нет запретных тем для разговора. В том числе и о сложившейся ситуации как на нашем заводе, так и в целом в стране. Уже достал кризис, так называемая неполная занятость. Где выход? Люди прямо говорят: надо выходить на площадь. Как это было в 1991 году... Это мнение сталелитейного, механосборочного, прессо-кузовного цехов, других производств».

Напомним, что с начала февраля МАЗ перешел на трехдневную рабочую неделю. Предприятие задерживает выплату зарплат, сокращает штат работников, продукция простаивает.

# Лидерам предпринимателей грозит до 12 лет тюрьмы

Арестованным лидерам предпринимателей Николаю Автуховичу, Юрию Леонову и Владимиру Осипенко предъявлено обвинение. Политзаключенные остаются в следственном изоляторе.

Как сообщил пресс-центру Хартии'97 правозащитник Олег Волчек, Николаю Автуховичу предъявили обвинение по статье 218 ч. 3 Уголовного кодекса - «Умышленные уничтожение либо повреждение имущества, совершенные организованной группой, либо повлекшие по неосторожности смерть человека или иные тяжкие последствия, либо повлекшие причинение ущерба в особо крупном размере». Предпринимателю грозит от 7 до 12 лет лишения свободы.

Юрию Леонову и Владимиру Осипенко предъявлено обвинение по статье 218 ч.2 Уголовного кодекса – «Умышленные уничтожение либо повреждение имущества, совершенные общеопасным способом либо повлекшие причинение ущерба в крупном размере». Предпринимателям грозит ограничение свободы на срок до пяти лет или лишение свободы на срок от трех до десяти лет.

Согласно официально озвученной версии, Николай Автухович, Юрий Леонов и Владимир Осипенко подозреваются в поджогах дома бывшего начальника Волковысского РОВД и гаража работника налоговой инспекции, которые произошли в 2004-2005 годах. В то же время сами жертвы поджогов никаких претензий к арестованным предпринимателям не высказали, так как виновники преступлений давно наказаны и отбывают наказание.

Узнать какие-либо еще подробности о судьбе арестованных предпринимателей невозможно. Известно только, что 15 февраля Юрий Леонов был переведен в республиканскую тюремную больницу с диагнозом «камни в почках».

# ЛИДЕРАМ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ ГРОЗИТ ДО 12 ЛЕТ ТЮРЬМЫ

«Адвокаты практически ничего не сообщают о расследовании уголовного дела против предпринимателей. Будем менять тактику. Родственники арестованных напишут заявления следователю о намерении выступить в качестве защитников. Адвокаты дали подписку о неразглашении, они не могут ничего говорить, а людей беспокоит судьба новых политзаключенных», -- сказал пресс-центру Хартии'97 Олег Волчек.

8 февраля в Волковыске были арестованы лидеры предпринимателей Николай Автухович, Юрий Леонов и Владимир Осипенко. «Операцию» по задержанию Автуховича, Леонова и Осипенко проводили сотрудники спецподразделения «Алмаз», вооруженные автоматами.

Сотрудниками силовых структур были проведены обыски в домах арестованных предпринимателей, в офисе фирмы «Ника-такси 22222», где они работают, в квартирах их друзей и знакомых (по некоторым данным, в Волковыске в тот день прошло 26 обысков).

Отметим, что Юрий Леонов и Николай Автухович – бывшие политзаключенные, приговоренные к лишению свободы по надуманному обвинению за защиту прав предпринимателей. В начале 2008 года мера наказания им была изменена на ограничение свободы. 10 февраля этого года в Волковыске должно было пройти судебное слушание по условно-досрочному освобождению Николая Автуховича.

17 февраля в ходе визита на могилевское ОАО «Бабушкина крынка» Александр Лукашенко заявил, комментируя аресты предпринимателей: «Они уже в оппозицию пошли. У нас как только где-то кого-то придушили за дело, типичный преступник - он тогда оппозиционер. Там, по-моему, что-то с оружием было связано. У нас закон один. Мы уже наелись 3 июля (взрыв на праздновании Дня независимости произошел 4 июля 2008 года). Пускай это там хлопок был какой-то, люди пострадали, но этого в стране быть не должно. Автоматы законно частнику хранить нельзя. И другие гранаты там, взрывные устройства. Жесточайший будет спрос. Террора в стране допустить я не могу».

Эти обвинения в интервью пресс-центру Хартии'97 опроверг правозащитник Олег Волчек.

«Никакой взрывчатки или оружия в домах Автуховича, Леонова и Осипенко изъято не было, просто потому что его там не было вообще. Были изъяты обычные паяльники и олово, которое, как известно, используется при паянии. Все эти обвинения говорят о том, что акция против лидеров предпринимателей была спланированной», - заявил правозащитник.

ИЗВЕСТНО, ЧТО СОГЛАСНО НАРОДНОЙ МУДРОСТИ, КАК 23-Е ФЕВРАЛЯ ВСТРЕТИШЬ, ТАК 8-Е МАРТА И ПРОВЕДЕШЬ. ИСХОДЯ ИЗ ЭТОГО, МЫ СПРОСИЛИ У ЖЕНЩИН МОГИЛЕВЩИНЫ:

## КАК ВЫ ПРАЗДНУЕТЕ ДЕНЬ 23 ФЕВРАЛЯ?

Нина, молодая женщина (Белыничи):
- Никак. Мы с мужем этот праздник не отмечаем, подарки дарим и праздничный стол накрываем на День святого Валентина. 23 февраля никогда не праздновали, вскоре после этого у мужа День рождения, тогда и организуем праздник, пригласим близких друзей.

Галина Ивановна, 50-55 лет, техработник в школе (Белыничи):
- Вечарам пастаўлю свайму дзеду бутэльку гарэлкі, пасядзім з ім крыху. Нікога ў госці запрашаць не будзем і самі нікуды не пойдзем.

Алена, кондуктор в городском автобусе (Могилев):
- Я в этот день работаю, так что весь праздник, по опыту знаю, особенно вторая половина дня, пройдет в борьбе с нетрезвыми пассажирами-мужчинами, многие из которых почему-то в этот день не хотят платить.

Виктория, историк (Горки):
- Этот день по-моему, должны больше немцы праздновать. Ведь это они в 18-м году большевиков разбили под Псковом, если не ошибаюсь. А при чем тут беларуская армия, вообще непонятно. Другое дело, что должен быть день мужчин, поэтому мужа вечером поздравлю, если не сильно пьяный придет.

Вика, молодая симпатичная девушка 20-22 лет (Белыничи):
- Поздравлю отца по телефону. Мужа у меня пока нет, любимого человека тоже (мило улыбается), поэтому, скорее всего, праздновать никак не буду. Может быть сходим с подругами на танцы. Хотя какие танцы, 23-го ведь, по-моему, понедельник?

Галина, экономист (Горки):
- На работе мужчин поздравим. А муж этот праздник не признает. Он свой День ВМФ летом отмечает.

№46 ЛЮТЫ 2009 Выбар

Магілеўская абласная газэта. Выдавец: Магілеўская абласная кааліцыя дэмакратычных сілаў.

Галоўны радактар: Эдуард Брокараў, тэл. 545 89 83, электронная адрэса: brok61@yandex.ru
Наклад: 299 асобнікаў, фармат А4, 8 палос.
Падчас выданьня ужываюцца: беларуская (тарашкевіца), беларуская (наркомаўка) ды расейская мовы. Матар'ялы друкуюцца на мове аўтара. Палітычная й моўная цэнзура адсутнічае. Вітаюцца мастацкія творы, а таксама – журналісцкія матар'ялы на беларускай мове. Погляды аўтараў могуць не супадаць з пазыцыяй радакцыі. Радакцыя самастойна прымае рашэньні аб мэтазгоднасьці ўступленьня ў перапіску, а таксама аб разьмяшчэньні бясплатнай сацыяльнай раклямы
У нумары выкарыстаны матар'ялы сайтаў: svaboda.org; racyja.com; milinkewits.org; pbnf.org; belsat.eu, uzgorak.na.by, atomby.net, charter97.org; horki.info.